Салаўёў М.

# НАШ ЗЕМЛЯК — ГЕРОЙ САВЕЦКАГА САЮЗА

Барыс Майстрэнка нарадзіўся 1 снежня 1924 года. Ужо больш года яго бацька Аляксандр Іванавіч працаваў на станцыі Асіповічы дарожным майстрам. Тут, у Асіповічах, сям'я Майстрэнка жыла да 1928 года, а затым Аляксандр Іванавіч быў пераведзяны на другую работу. Праз некалькі гадоў сям'і Майстрэнка прыйшлося зноў змяніць месца жыхарства: Аляксандра Іванавіча перавялі ў Жлобін начальнікам дыстанцыі пуці. Адсюль, у 1937 годзе, ён пераехаў у горад Ноўгарад-Северскі.

З гэтага горада Барыс пайшоў у жніўні 1941 года на ўсход, каб не застацца на акупіраванай тэрыторыі. Накіраваўся ў Маскву, да сваякоў. "Сваякоў не знайшоў, – піша бацька Барыса Аляксандр Іванавіч, – і самастойна дабраўся да Ташкента".

Яшчэ ў час сваіх падарожжаў па чыгунцы Барыс цвёрда вырашыў, што яго месца – у арміі. Таму юнак першым чынам даведаўся, дзе знаходзіцца ваекамат. Яму ўдалося папасці да ваенкома.

– З якога ты года?

– З дваццаць трэцяга, – без запінкі адказаў юнак.

– А дзе твае бацькі?

– Засталіся на Украіне, у горадзе Ноўгарад-Северскім.

– Танкістам хочаш быць?

– Жадаю.

– Пашлём у танкавае вучылішча, – паабяцаў ваенком.

Так вызначыўся далейшы лёс Барыса Майстрэнка. Ён стаў курсантам танкавага вучылішча.

...У 1942 годзе, у 152-й асобнай танкавай брыгадзе Ленінградскага фронту, з'явіўся малады лейтэнант. Гэта быў Барыс Майстрэнка. Назначылі яго камандзірам "трыццацьчацвёркі".

Прайшло два гады баявога жыцця. За гэты час Барысу давялося ўдзельнічаць у многіх баях. Ён паказаў сябе сталым і смелым камандзірам і да пачатку 1944 года меў ужо баявыя ўзнагароды – ордэн Чырвонай Зоркі і медаль "За адвагу".

10 чэрвеня 1944 года на Карэльскім перашыйку нашы войскі перайшлі ў наступленне. Трэба было прарваць тры паласы варожай абароны і, зламаўшы супраціўленне гітлераўскіх акупантаў, вызваліць горад Выбарг, выйсці на бераг Фінскага заліва.

Танкаваму батальёну, у склад якога ўваходзіў экіпаж Барыса Майстрэнка, было загадана суправаджаць наступаючую пяхоту. Танкісты рухаліся наперад, агнём і гусеніцамі пракладвалі шлях

нашым падраздзяленням. "Т-34" лейтэнанта Майстрэнка першым дасягнуў абароннага рубяжа праціўніка.

– Наперад! – загадана механіку-вадзіцелю.

Раптоўнасць нападу зрабіла сваю справу. У гэтым баі экіпаж Барыса Майстрэнка знішчыў чатыры супрацьтанкавыя гарматы, тры дзоты, два станкавыя і адзін ручны кулямёты і не менш як пяцьдзесят салдат і афіцэраў праціўніка.

Наступленне на Карэльскім перашыйку развівалася паспяхова, і 152-я асобная танкавая брыгада выйшла да ракі Сума-Йокі. Першым да воднай перашкоды падыйшоў танк лейтэнанта Майстрэнка.

Фарсіравалі раку з ходу. У двух кіламетрах паўднёва-заходняй вёскі Каўкярванкуля "трыццацьчацвёрка" дасягнула скрыжавання дарог. Экіпаж баявой машыны аказаўся ў выгадным становішчы, і Майстрэнка адразу ацаніў гэта. Ён загадаў экіпажу:

– Тут затрымаем праціўніка да падыходу галоўных сіл брыгады.

Танкісты занялі пазіцыю, замаскіравалі баявую машыну і падрыхтаваліся да сустрэчы гітлераўцаў. Яны не прымусілі сябе чакаць. Завязаўся бой. Цягнуўся ён некалькі гадзін. За гэты час экіпаж лейтэнанта Майстрэнка знішчыў 10 аўтамашын з ваеннай маёмасцю і боепрыпасамі, каля 30 салдат і афіцэраў праціўніка. Захопленае перакрыжаванне дарог танкісты ўтрымлівалі да падыходу асноўных сіл брыгады.

152-я танкавая брыгада мела багаты вопыт прарыву абаронных рубяжоў гітлераўцаў. Таму і выконвала яна самыя складаныя аперацыі. У адным з такіх суровых баёў, калі засталося прарваць трэцюю, апошнюю паласу абароны фашыстаў, загінуў камандзір танкавай роты. Гэта заўважыў Майстрэнка і прыняў камандаванне ротай на сябе.

У гэты момант з гітлераўскага доту па нашых пехацінцах нямецкі кулямётчык вёў інтэнсіўны агонь.

– Да дота! – загадаў лейтэнант механіку-вадзіцелю сваёй машыны. – Закрыем бранёй амбразуру.

Манеўр удаўся. Гітлераўцы пакінулі дот і спрабавалі ўцячы. Аднак былі знішчаны.

За мужнасць і адвагу, якія былі праяўлены ў баях, 25 чэрвеня 1944 года камандзір 1-га танкавага батальёна капітан Іваноў прадставіў лейтэнанта Барыса Майстрэнка да звання Героя Савецкага Саюза. Яго хадайніцтва падтрымаў камандзір брыгады. 24 сакавіка 1945 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў Барысу Аляксандравічу Майстрэнка гэта высокае званне.

Толькі Барыс аб гэтым не даведаўся... 15 студзеня 1945 года ён быў цяжка паранены ў баі. Камандзір батальёна загадаў санітарам тэрмінова даставіць параненага ў медсанбат 254-й стралковай дывізіі, у баявых парадках якой рухаліся танкісты. Але давезці Барыса да санбата не ўдалося. У дарозе старшы лейтэнант памёр. Герой Савецкага Саюза Барыс Майстрэнка пахаваны каля вёскі Хмелік-Млін.

**Салаўёў, М. Наш зямляк — Герой Савецкага Саюза / М. Салаўёў // Запаветы Леніна (Асіповічы). — 1973. — 15 мая. — С. 2.**